Свята ў хату

СВАЁ — НАЙЛЕПШАЕ!

У Віцебску ўпершыню прайшоў Дзень беларускага брэнда. Айчынныя вытворцы, рамеснікі, артысты запрасілі да сябе ў культурна-гістарычны комплекс «Залатое кольца горада Віцебска «Дзвіна».

Дэвізам мерапрыемства стала «Свае сярод сваіх!» Ахвотных убачыць свята і зрабіць пакупкі было параўнальна шмат. Тым больш што яно праходзіла на беразе Заходняй Дзвіны, у адным з самых маляўнічых куткоў старажытнага горада. Тут любяць бавіць час тутэйшыя і турысты.

Як падкрэсліў **намеснік старшыні Віцебскага гарвыканкама Віктар ГЛУШЫН**, некалькі дзён таму ў абласным цэнтры была адменена забарона на правядзенне масавых мерапрыемстваў. У ліку арганізатараў былі камітэт эканомікі аблвыканкама, абласная арганізацыя БРСМ, «БелБрэндАўдыт», «Цэнтр культуры «Віцебск» і іншыя.

Праграму падрыхтавалі вельмі насычаную і разлічаную на аўдыторыю розных узростаў. Напрыклад, можна было ўбачыць экспанаты выстаўкі маладзёжных інавацыйных праектаў. Уражвалі выступленні тых, хто захапляецца чарлідынгам (шоу з элементамі акрабатыкі, гімнастыкі, танцаў), іншымі папулярнымі кірункамі спорту і вулічнага адпачынку.

Прыемным сюрпрызам стаў арт-квэст па гістарычных і культурных мясцінах Віцебска.

Што цяпер модна? — пра гэта можна было даведацца, дзякуючы цырымоніі ўзнагароджання пераможцаў рэспубліканскага сацыялагічнага даследавання «Маладзёжны брэнд — 2020». Сёлета яно, дарэчы, было праведзена пяты раз. Каля 1,2 тысячы рэспандэнтаў падзяліліся сваімі думкамі.

Адзначылі і найлепшых удзельнікаў абласнога этапу конкурсу прафмайстэрства WorldSkills Belarus. Вельмі вабілі пункты, дзе прадавалі адзенне, абутак, мёд, прадукты пчалярства. Як заўсёды, былі вельмі цікавымі для набыцця танныя, але вельмі якасныя тавары для дома ад устаноў адукацыі.

Людзі куплялі і розныя гатункі гарбаты, выробленыя па старадаўніх беларускіх рэцэптах, сувеніры ад рамеснікаў, кавалёў.

Усіх найменняў тавараў — сотні.

Можна было за сімвалічны кошт атрымаць майстар-клас ад умельцаў. Нават чарга з'явілася да ганчара, які прапаноўваў экспрэс-навучанне.

Музыканты і выканаўцы, у тым ліку і лаўрэаты рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў, паказы традыцыйных беларускіх строяў і сучаснай моды, нефармальная атмасфера, цудоўнае сонечнае надвор'е — усё гэта спрыяла добраму настрою гараджан і гасцей горада.

Арганізатары агучылі ідэю праводзіць свята і ў іншых абласных цэнтрах.

Аляксандр ПУКШАНСКІ, фота аўтара.

Надвор'е

ДАЖДЖЫ, ЯШЧЭ ДАЖДЖЫ...

Уначы ў сярэдзіне тыдня тэмпература паветра апусціцца да плюс 7 градусаў

Гэтымі днямі надвор'е ў Беларусі яшчэ фарміруе цёплае паветра, але паўночна-заходнія рэгіёны ўжо прыкрытыя аблокамі. Гэта адбіваецца ўплыў франтальнага падзелу, які прыносіць змены ў характары надвор'я. Услед за атмасферным фронтам на тэрыторыю нашай краіны пачне распаўсюджвацца халаднаватае паветра са Скандынаўскага паўвострава, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Ужо сёння на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць дажджы. А тэмпература ўсталюецца кантрасная — ад плюс 16 градусаў да 23–28 цяпла ў паўднёва-ўсходніх раёнах. У сераду надвор'е ў нашым рэгіёне пачнуць фарміраваць прахалодная паветраная маса і малаактыўныя атмасферныя франты. Будзе воблачна з праясненнямі. Уначы па ўсходзе, удзень месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах — навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 7 да 14 градусаў, ды і ўдзень будзе адносна халаднавата — 17–22 градусаў вышэй за нуль.

Подых марскога паветра мы адчуем у чацвер. У гэты дзень адаб'ецца ўплыў няўстойлівай свежай паветранай масы, якая паступае з Балтыйскага мора. Будзе воблачна з праясненнямі. Уначы месцамі, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць невялікія кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаецца слабы туман. Вецер прагназуецца заходні, умераны. Тэмпература паветра ўначы складзе 7–12 цяпла, удзень — ад плюс 17 да плюс 22 градусаў.

Сонца зробіць перапынак па выдачы добрага ліпеньскага цяпла, але ненадоўга. У пятніцу атмасферны ціск вырасце, і аблокаў стане менш. Дажджы ў многіх рэгіёнах спыняцца, толькі ўдзень па захадзе краіны магчымы кароткачасовыя дажджы з навальніцамі. Уначы і раніцай месцамі па Беларусі могуць утварацца непрацяглыя слабыя туманы. Вецер прагназуецца паўднёвы ўмераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 8 цяпла да плюс 14 градусаў. Удзень будзе 19–25 цяпла, у паўднёвых раёнах — да плюс 27 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у суботу пад уплывам франтальнага падзелу на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі з навальніцамі. Вецер прагназуецца паўднёвы з пераходам на заходні, умераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ў сярэдзіне дня складзе 20—27 цяпла, па паўднёвым усходзе краіны да плюс 30 градусаў. Ліпень, як ні круці.

Сяргей КУРКАЧ.

Запрашальнік

ПА «КУПАЛЬСКІМ КОЛЕ»

Калі турыстычны маршрут «Залатое кола» ў суседняй Расіі вядомы ўжо даўно, дык беларускае «Купальскае кола» — з'ява ў турыстычным бізнесе адносна маладая, але набыць не меншую папулярнасць і сярод беларусаў, і сярод гасцей нашай краіны мае ўсе перадумовы.

Падзейны турызм штогод набірае абароты па ўсім свеце. Прыехаць не толькі паглядзець пэўны населены пункт, але і папрысутнічаць на адмысловым мясцовым фэсце сёння ў трэндзе і сярод моладзі, і сярод людзей больш сталага ўзросту. Пандэмія крыху ўнесла карэктывы ў гэту тэндэнцыю, але ўсё пакрысе вяртаецца ў ранейшае рэчышча. Таму на купальскім свяце «Александрыя збірае сяброў», якое адбудзецца ў Шклоўскім раёне ўжо ў наступныя выхадныя, чакаюць сотні гасцей з усіх рэгіёнаў Беларусі, а таксама з блізкага і далёкага замежжа.

Праграма фестывалю, як заўжды, будзе яркая і насычаная — і вялікая канцэртная праграма, і кірмаш, на якім можна не толькі ўбачыць і набыць вырабы народных майстроў, але і прычыніцца да іх стварэння. Але, несумненна, многія захочуць пазнаёміцца бліжэй і з месцам, дзе праходзіць свята, і з наваколлем. Менавіта для такіх цікаўных і няўрымслівых гасцей «Магілёўаблтурыст» распрацаваў маршрут «Купальскае кола». Далучыўшыся да яго, ахвотныя змогуць праехаць з агляднай экскурсіяй па Шклове і Магілёве. І, канешне, даведацца шмат цікавага пра сталіцу купальскага дзейства — аграгарадок Александрыя.

У прыватнасці, экскурсійная праграма прапануе наведванне прамысловага саду з прымяненнем кропельнага паліву, сучаснага комплексу па захоўванні яблыкаў. Там жа турысты могуць убачыць на свае вочы, як у прамысловых маштабах вырошчваюць любімыя ўсімі грыбы — вешанкі.

Асобным пунктам у маршруце значыцца наведванне школы, у якой вучыўся Прэзідэнт Беларусі. Самым папулярным месцам у турыстаў з'яўляецца парта, за якой Аляксандр Лукашэнка сядзеў, калі быў вучнем. Вакол яе ўжо нават склалася своеасаблівая прыкмета: лічыцца, што ў таго, хто пасядзіць на гэтым месцы, кар'ера імкліва пойдзе ўгару.

Ці збываецца гэтая прыкмета? Самы надзейны спосаб праверыць — паспрабаваць самому. Планы на наступныя выхадныя можна скарэкціраваць. А да Александрыі з любога месца краіны зусім недалёка.

Аляксей КЛІМАЎ.

Будзь у курсе!

НА «СЛАВЯНСКІ БАЗАР» І НАЗАД — АДНЫМ ЦЯГНІКОМ

Беларуская чыгунка на час правядзення XXIX Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» прызначыла цягнік міжрэгіянальных ліній № 644/643 Мінск — Віцебск — Мінск.

Расклад руху цягніка складзены з улікам праграмы правядзення фестывалю. Ён будзе курсіраваць штодня з Мінска з 16 да 19 ліпеня, а з Віцебска — з 17 да 20 ліпеня, паведамляе прэс-цэнтр магістралі.

Са станцыі Мінск-Пасажырскі цягнік адправіцца ў 12.28 і прыбудзе ў Віцебск у 16.08.

Пасля завяршэння канцэртнай праграмы госці «Славянскага базару» на гэтым жа цягніку змогуць вярнуцца ў Мінск. З Віцебска ён будзе адпраўляцца ноччу ў 1.12 і прыбываць у сталіцу раніцай у 5.42.

Папярэдні продаж праязных дакументаў (білетаў) на фестывальны цягнік вядзецца за 20 сутак да яго адпраўлення.

Набыць праязныя дакументы можна на афіцыйным сайце Беларускай чыгункі ў раздзеле «Паслугі пасажырам» (pass.rw.by), з дапамогай мабільнай праграмы «БЧ. Мой цягнік», а таксама ў чыгуначных касах.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Пайшоў з жыцця кампазітар Эніа Марыконэ

У Рыме пайшоў з жыцця кампазітар Эніа Марыконэ. Як паведамляе інфармагенцтва Ansa, ён памёр у бальніцы. Прычынай смерці сталі наступствы няўдалага падзення. Эніа Марыконэ быў 91 год. У бальніцу ён паступіў некалькі дзён таму з пераломам сцягна. Эніа Марыконэ нарадзіўся 10 лістапада 1928 года ў Рыме. Ён скончыў кансерваторыю Санта-Сэсілія адразу па трох класах — трубы, інструментоўкі і кампазіцыі. Пісаць музыку для кінематографа і рабіць аранжыроўкі ён пачаў толькі пасля 33 гадоў. За сваё жыццё напісаў музыку для больш чым 400 фільмаў і серыялаў, а таксама больш за сотню класічных твораў. Ён аўтар музыкі да карцін «Аднойчы ў Амерыцы», «Прафесіянал», «Недатыкальныя», «Добры, дрэнны, злы», «Джанга вызвалены», «Агідная васьмёрка» і многіх іншых. Марыконэ атрымаў два «Оскары» за музыку да «Агіднай васьмёркі» і за ўклад у кінамастацтва. Ён тройчы станавіўся лаўрэатам «Залатога глобуса», шэсць разоў — лаўрэатам прэміі BAFTA, дзевяць разоў — нацыянальнай кінапрэміі Італіі «Давід дзі Данатэла». Бывайце, Маэстра...

Партыя прэм'ера Харватыі сфарміруе кабінет па выніках выбараў

Кіруючая партыя прэм'ер-міністра Харватыі Андрэя Пленкавіча «Харвацкая дэмакратычная садружнасць» (ХДС) атрымала перамогу на парламенцкіх выбарах. ХДС можа разлічваць на 68 мандатаў у 151-месным парламенце, паведаміла Euronews. «Гэта вялікая перамога. Але такі вынік ускладае на нас велізарную адказнасць, паколькі мінулы парламенцкі тэрмін быў цяжкі і поўны выпрабаванняў, а выклікі, якія стаяць перад намі, выглядаюць вельмі сур'ёзнымі», — заўважыў Андрэй Пленкавіч. Апаненты кіруючай ХДС — кааліцыя «Перазагрузка» на чале з Сацыял-дэмакратычнай партыяй, зойміць у заканадаўчым органе крыху больш за сорак месцаў. Трэцяя па велічыні палітычная сіла — «Рух за Айчыну» спевака і прадпрымальніка Міраслава Шкора — можа разлічваць на 15 дэпутацкіх месцаў.

Індыец замовіў залатую маску для абароны ад вірусаў

Жыхар горада Пімпры-Чынчвад на захадзе Індыі пачаў насіць залатую маску, каб прадухіліць заражэнне каранавірусам COVID-19, паведаміла газета Hindustan Times. Бізнесмен Шанкар Курадэ заплаціў за маску каля 4 тысяч долараў. За гэтую суму ў Індыі можна купіць звыш мільёна звычайных масак. У залатым вырабе зробленыя дробныя адтуліны, праз якія можна дыхаць. Курадэ прызнаўся, што не ўпэўнены ў эфектыўнасці такога спосабу засцярогі. Ён расказаў, што ідэя зрабіць залатую маску прыйшла да яго пасля прагляду відэа чалавека, які ходзіць у такой жа срэбнай масцы. Маска Курадэ зроблена з тонкай залатой пласціны, якая працятая залатымі ніткамі для трываласці. Горад Пімпры-Чынчвад знаходзіцца ў індыйскім штаце Махараштра, які мацней за ўсё пацярпеў ад эпідэміі COVID-19. За гэты год у штаце памерла ад заражэння больш за 8,3 тысячы чалавек.